Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Дзіцячы сад№5 г.Пружаны”

# Чароўны куфэрак
(старшая група, Адукацыйная галіна “Музычнае мастацтва”)

Музычны кіраўнік:
Туча В.Ў.
Вышэйшая кваліфікацыйная
катэгорыя

**Мэта:**
фарміраваць цікавасць да беларускай мовы, абагульненыя спосабы музычнага мыслення і дзейнасці ў працэсе творчага засваення музыкі.
**Задачы:**
развіваць здольнасць адчуваць эмацыянальную выразнасць рытму і перадаваць яго ў руху; патрэбнасць у самастойнай ігры на музычных інструментах;
фарміраваць уяўленне аб розных відах беларускага фальклору; маўленчыя і вакальна-харавыя уменні і навыкі;
выхоўваць у дзяцей любоў да сваёй спадчыны; творчыя адносіны да розных відаў музычнай дзейнасці;
**Абсталяванне:**
мультымедыйная прэзентацыя; музычныя інстременты (дудка, цымбалы, бубен, гармонік).

**Ход занятку**

*У залу заходзяць дзеці*

Музычны кіраўнік: Добры дзень, мае сябры.
Я чакаю вас заўжды,
Невясёлых не прымаю.
Хто сумленны – той мой госць,
Вось, якая весялосць!

*Чуецца стук у дзверы. У залу ўваходзіць выхавацель з лялькай Марылькай.*

Музычны кіраўнік: Дарагія дзеці, да нас сёння у госці завітала лялька Марыля! Давайце мы з ёй павітаемся.

***Музычнае прывітанне***

Музычны кіраўнік: Добры дзень, дзяўчынкі!
Дзяўчынкі: Добры дзень!
Музычны кіраўнік: Добры дзень, хлопчыкі!
Хлопчыкі: Добры дзень!
Марылька: Добры дзень, дзеці!
Дзеці: Добры дзень!
Музычны кіраўнік: Добры дзень, госци!
Госци: Добры дзень.
А зараз пачнем наш занятак. И перш выканаем практыкаванни.Мы з вами пачпли вывучаць рухи беларускай польки. Бегут п кругу, падскоки, ковырялочка. Малайцы

Музычны кіраўнік: Калі ласка, дарагія дзеці, сядайце (*Дзеці сядаюць).*
*Попевка, пальчыкавая гульня,дыхание*
Пальцы ў хованкі гулялі (Згінаюць і разгінаюць пальцы.)
І галоўкі ўсе схавалі. (Збіраюць пальцы ў кулак.)

Раз, два, тры, Раз, два, тры. Дзе галоўкі? (Паварочваюць кулакі ў бакі.) Вось яны! (Паказваюць пальцы.)

Глядзіце, дзеці, што за цуд?
З'явіўся куфар у нас тут.

Калісьці ў такіх куфэрках хавалі скарбы і закопвалі іх у зямлю. У гэтым чароўным куфэрку таксама захаваліся незлічоныя скарбы. Толькі тэта не залатыя дукаты і каштоўныя ўпрыгожванні. У маім куфэрку загадкі, прымаўкі, народныя гульні, жарты. Ці адкрываць куфэрак?

Дзеці: Адкрываць!

Марылька: А з чаго пачынаць?

Дзеці: З загадак.

Музычны кіраўнік: Так, бо яны лічацца скарбонкай народнай мудрасці і назіральнасці. А беларусы, заўсёды вызначаліся здатнасцю жартаў і кемлівасцю.

Марылька: А, ну-ка дзеткі, адгадайце загадкі.

1. Хоць вялікі
   Ды пусты,
   Мае голас ён
   Густы.
   Да таго ж –
   Артыст вядомы,
   Выбівае дроб
   Без стомы. *(Бубен)*

Музычны кіраўнік: Бубен - гэта інструмент усіх народаў свету. Былі і у Беларусі музыкі, якія спявалі народныя песні і гралі на бубне. Часам яны дазвалялі сабе жарты-стукалі бубнам па галаве, білі падбародкам, локцямі і г.д. Вось так яны рабілі *(паказвае пад музыку)* Слухайце далей.

2. Што за скрынка.
   Скрынка-весялінка,-
   Як яе раскатурхаў-
   Ўвесь клуб затупаў? *(Гармонік)*

Музычны кіраўнік: Гармонік прыйшоў да нас у Беларусь з Расіі. У Беларусі народныя святы не абыходзяцца без гармоніка. У любы момант гарманіст можа заспяваць і пра сваю працу, і пра сваю сям'ю, і пра суседа. Быў бы побач гармонік.

Наступная загадка.

3. Гэта - інструмент народны,
   І вясёлы,
   І журботны...
   Струн у ім
   Мо з сотню ёсць.
   Вось дзе цуд,
   Дзе прыгажосць... *(Цымбалы)*

Музычны кіраўнік: На Беларусі цымбалы з'явіліся даўно. Іх вельмі любяць нашыя людзі. На іх граюць народныя песні, танцы. Калі толькі ўдарыш па струнах двумя малаточкамі, адразу павесялееш.
А цяпер паслухайце апошнюю загадку.

4. Калі жадаеш пагуляць,
Трэба ў рукі яе ўзяць.
Злёгку ў дзірачку падуць
Музыку цудоўную пачуць. *(Дудка)*

Музычны кіраўнік: Беларуская дудка – гэта вельмі цікавы музычны інструмент. Дудка вырабляецца з дрэва і бывае рознай велічыні.
Малайцы Столькі цудоўных загадак адгадалі.
Музычны кіраўнік: Музычныя інструменты, такія як гармонік, цымбалы, дудка ўваходзяць у склад аркестраў, ансамбляў беларускіх народных інструментаў. Яны адрозніваюцца ад другіх мілагучнасцю і чысцінёй гукаў.
Музычны кіраўнік: А можа і сярод вас ёсць жадаючыя паіграць на гэтых музычных інструментах? (*Адказы дзяцей)*. Малайцы! Зараз мы з вамі будзем граць ў аркестры. " **Зайграй жа мне дударочку"**

***Аркестр.***

Добра, малайцы. Выдатные музыканцікі з вас атрымаліся.
Музычны кіраўнік: Зараз пабачым, а што яшчэ знаходзіцца ў чароўным куфэрку? (дастае гарлачык)Беларускія гульні, бо яны прыносяць радасць і выдатны настрой.

Ну што мае сябры!
Нам на месцы не сядзіцца,
Любім мы павесяліцца,
Нашы ножкі не стаяць,
Яны хочуць пагуляць.

Музычны кіраўнік: Зараз мы пагуляем з вамі ў гульню "Гарлачык".
Толькі адразу сярод вас мы з дапамогай лічылкі знойдзем самага галоўнага.
Лічылка
Раз, два, тры, чатыры,
Ката грамаце вучылі.
Не чытаць, не пісаць,
А за мышками скакаць.

***Гульня "Гарлачык"***

Малайцы, мае сябры. І спрытныя вы, і вясёлыя. А яшчэ ў чароўным куфэрку знаходзіцца моўны скарб - народныя легенды і паданні.
Музычны кіраўнік: Усе вы любіце слухаць, як апавядаюць пра што-небудзь цікавае. Пра тое, што было даўным-даўно, расказваюць легенды і паданні. Паслухайце, калі ласка, адно з іх. Ці то полем, ці то лесам ішлі тры падарожнікі. Ішлі яны тры дні і тры ночы, ды яшчэ паўдня. Прытаміліся. Прыселі. Раптам чуюць — спявае нехта.

Прыслухаўся першы:
-Відаць, жаўранак.

-Не, - кажа другі, - гэта лес шуміць.

А трэці прыпаў вухам да зямлі і прашаптаў:

-Ды гэта ж зямля наша спявае. **(МУЗЫЧНАЯ ПРЭЗЕНТАЦЫЯ “Спеу дубрау” )**

Музычны кіраўнік: Вось якая яна, наша зямля беларуская. Таму ў нас і песні такія прыгожыя. Нашы дзеці таксама ведаюць вельмі прыгожую песню і зараз яны яе праспяваюць.

***<u>Песня “Беларусь мой дом” муз.С.Галкінай, сл. Н.Галіноўскай</u>***

Марылька: Як прыгожа вы праспявалі гэтую песню. Лірычна, напеўна і вельмі пяшчотна.

Музычны кіраўнік: Музыка гучыць ў нашай мове, у нашым слове. Каб не было музыкі, не было б у нас песень, не было б і танцаў. Сумна было бы жыць на белым свеце.

Давайце будзем танцаваць вясёлы беларускі народны танец “Лявониха”.

***Танец”Лявониха”***

Малайцы, вы вельмі прыгожа танцавалі.

Звычай народа - наша багацце,
Скарбніца, што застаецца на шчасце!
І скарб гэты трэба усім захаваць,
Каб потым нашчадкам сваім перадаць.

Бачыце, колькі скарбаў захаваў для вас чароўны куфэрак. А колькі ў ім яшчэ засталося, вы даведаецеся у наступны раз. Але ж мне ўжо пара развітацца з вамі.

***Музычнае развітанне***

*Выхавацель з лялькай Марылькай выходзяць з музычнай залы.*

Музычны кіраўнік: Паважаныя дзеці. Я спадзяюся, што вам спадабаўся чароўны куфэрак.Адкажыце, калі ласка, якія скарбы ў ім знаходзіліся? *(адказы дзяцей)*

Якія музычныя інструменты складаюць беларускі народны аркестр? *(адказы дзяцей)*

Ў якія беларускія народныя гульні вам падабаецца гуляць? *(адказы дзяцей)*

А якія яшчэ скарбы былі захаваны ў чароўным куфэрку? *(адказы дзяцей)*

Музычны кіраўнік: Вось і скончыўся наш занятак. Няхай доўжыцца радасць, натхненне, добры настрой і імкненне да народнай мудрасці! Да новых сустрэч!

*Пад беларускую народную музыку дзеці выходзяць з музычнай залы.*